# Гродна – сталіца княства

**Цікавая сустрэча з вядомымі гісторыкамі, прымеркаваная да 620-годдзя надання гораду Гродна статусу другой сталіцы ВКЛ, прайшла за круглым сталом Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Карскага.**

*"Што асноўнае і самае незвычайнае ёсць у Гродне, што магло б прываблiваць турыстаў?"*, – гэтым пытаннем задаюцца не толькі многія гісторыкі, але і звычайныя людзі. Адзін з адказаў гучыць так – *"Каралеўскі статус"*. Як расказала доктар гістарычных навук, прафесар **Святлана Марозава**, пасля заключэння Крэўскай уніі ўзнікла моцная антыкрэўская і антыягайлава апазіцыя. Барацьба бакоў завяршылася заключэннем 5 жніўня 1392 года пагаднення ў мястэчку Востраў пад Лідай. Сюды з'ехаліся прадстаўнікі пануючай у ВКЛ дынастыі, Ягайла, яго жонка Ядвіга, Вітаўт, беларускія і літоўскія феадалы. Тут вырашаліся далейшыя лёсы ўсходняй і цэнтральнай Еўропы, тут стваралася вялікая еўрапейская палітыка.

Востраўскае пагадненне ўзмацняе самастойнасць ВКЛ, а Вітаўт, да таго князь Гарадзенскі, становіцца Вялікім князем літоўскім. Яго каранацыя адбываецца ў Вільні, а Гародня па-ранейшаму застаецца княжацкай рэзідэнцыяй, дзе ён жыве са сваёй сям'ёй. Такім чынам, у нейкай меры ўмоўна лічыцца, што Гродна атрымаў статус другой сталіцы Вялікага княства Літоўскага.



Рэканструкцыю рыцарскай зброі, жаночых касцюмаў XIII-XIV стагоддзяў прадэманстравалі прадстаўнікі рыцарскага клуба "Гарадзенскі двузуб". Аб вялікіх постацях Гродна на яго гістарычных шляхах нагадаў прафесар ГрДУ Аляксей Пяткевіч, даклады на канфесійную тэматыку падрыхтавалі намеснік дырэктара Гродзенскага музея гісторыі рэлігіі Ігар Ганчарук, доктар тэалогіі Юзаф Макарчык. Цікавымі былі выступленні ўсіх гісторыкаў, а таксама студэнтаў ГрДУ імя Янкі Купалы.



***Вольга Кацько***
***Фота аўтара***